УДК 781. 7(476.5) + 784.4(476.5)

*Тетяна Костянтинова (Мінськ)*

# ВОЛОЧЕБНІ НАСПІВИ ПІВНІЧНОБІЛОРУСЬКОЇ ТРАДИЦІЇ: АРЕАЛЬНИЙ АСПЕКТ

*Таццяна Канстанцінава (Мінск)*

# ВАЛАЧОБНЫЯ НАПЕВЫ ПАЎНОЧНАБЕЛАРУСКАЙ ТРАДЫЦЫІ: АРЭАЛЬНЫ АСПЕКТ



*Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі.*
*Тел.: +375 29 2790380, e-mail: talekon@mail.ru*

У центрі уваги статті – волочебні наспіви білоруської Півночі у їх типологічних та ареальних характеристиках. Дослідження приводить до висновку, що центром північнобілоруських волочебних традицій є правобережні території Вітебського Подвиння і південні райони Псковської області.

*Ключові слова*: північнобілоруський регіон, народнопісенна традиція, музично-типологічна класифікація, волочебний наспів (паўночнабеларускі рэгіён, народнапесенная традыцыя, музычна-тыпалагічная класіфікацыя, валачобны напеў)

**Стаття ілюстрована аудіоприкладами на DVD_CM4_23_BLR-VLCH-Kanstant**
**Картосхеми див. в Атласі на стор. К6–К8**

Паўночны гісторыка-этнаграфічны рэгіён Беларусі належыць да надзвычай складаных і цікавых этнакультурных феноменаў. Яркасць існуючых тут музычна-фальклорных, этнаграфічных, моўных традыцый і форм актыўна прыцягвае да сябе ўвагу гісторыкаў культуры, лінгвістаў, археолагаў, этнографаў, этнамузыколагаў.

Паўночнабеларускі рэгіён, які вылучаецца на падставе гістарычных, этнакультурных і лінгвістычных крытэрыяў, ў адпаведнасці з геамарфалагічнымі асаблівасцямі тэрыторыі атрымаў назву Беларускае Паазер'е. Ён месціцца ў басейне сярэдняга цячэння Заходняй Дзвіны і яе прытокаў і асноўнай сваёй часткай супадае з тэрыторыяй сучаснай Віцебскай вобласці, у сувязі з чым шэрагам даследчыкаў вызначаецца таксама як Віцебскае Падзвінне.

Паўночная Беларусь уваходзіць у склад тэрыторый найбольш старажытных пасяленняў усходніх славян. Медыяльнае геаграфічнае становішча на еўрапейскай прасторы, знаходжанне як бы на стыку трох "сусветаў" – славянскага, балцкага, фіна-ўгорскага – вызначылі складанасць этнічных, а таксама гісторыка-культурных працэсаў, якія адбываліся на гэтых землях у розныя часы. Фіксацыя паўночнабеларускіх тэрыторый як тэрыторый, што знітаваны рэгіянальна выразнымі формамі традыцыйнай культуры, адлюстроўвае этнакультурныя рэаліі сённяшняга часу.

Яркую і самабытную народнапесенную традыцыю паўночнабеларускага рэгіёну характарызуе маштабнае захаванне ўсіх гісторыка-стылявых пластоў песеннай творчасці. Аднак найзначная роля ў гэтай сістэме належыць раннетрадыцыйнаму пласту – перш за ўсё песенна-абрадавым практыкам каляндарна-земляробчага і сямейна-абрадавага цыклаў. У іх ліку – песенныя рытуальныя абходы Вялікадня.

Пры паўсюднасці і дастатковай распрацаванасці ў розных народаў Еўропы комплексу традыцыйных абрадаў, прыстасаваных да пасхальнага перыяду, валачобны абход звяртае на сябе ўвагу дакладнай геаграфічнай лакалізацыяй. Большая частка тэрыторыі яго пашырэння ў пэўнай ступені суадносіцца з беларускім макраарэалам[1].

Што датычыць геаграфічнай прасторы валачобных абходных практык, яна ў найбольшай ступені дыферэнцуецца менавіта паводле песеннага кампанента. Спробы музычна-тыпалагічнай класіфікацыі валачобных абрадавых напеваў здзяйсняліся неаднаразова. В. Ялатавым [1, с. 39–46], Л. Мухарынскай [7, с. 50–52], З. Мажэйка [6, с. 94–96] была зафіксавана наяўнасць чатырох *песенна-меладыйных тыпаў* валачобных. Аднак аб'яднанне напеваў у пэўныя тыпалагічныя групы ў названых даследчыкаў мае некаторыя адрозненні. Пры разглядзе валачобных песень С. Мыцько і С. Латышава ў якасці параметраў класіфікацыі абралі асобныя элементы іх музычна-паэтычнага комплексу. Так, С. Мыцько даводзіць аб пяці тыпах валачобных песень па структуры вершарадка і музычна-паэтычнай рытміцы [8, с. 53] і пятнаццаці па формульных напевах [8, с. 60–61]. С. Латышава вылучае два рытмавыя тыпы валачобных напеваў, "якія існуюць у сістэме відаў і версій" [5, с. 16] і, у

[1] "Беларускі макраарэал" акрамя сучаснай Беларусі ўключае па-за яе межамі шэраг прылеглых тэрыторый, якія па асаблівасцях мовы і традыцыйнай культуры ўтвараюць з беларускімі адзіную прастору. "Тэрыторыяй беларускага племені" яе называў у пачатку XX стагоддзя Я. Карскі.

адпаведнасці з гукавышыннай будовай, дзве групы напеваў, “якія адрозніваюцца па тыпе сувязі гукаў, што рэалізуюць апазіцыю тоеснасці і кантрасту ў вертыкальным кампаненце лада” [5, с. 18].

У свой час намі была прапанавана класіфікацыя, у якой пяць буйных тыпалагічных груп валачобных напеваў былі вылучаны згодна комплексу музычна-стылістычных асаблівасцей, які ўлічвае такія марфалагічныя ўзроўні, як музычна-паэтычны, рытмаструктурны і ладаінтанацыйны [2, с. 71–75]. Комплексны падыход у вылучэнні тыпаў каляндарных напеваў натуральна вынікае з паняцця “*голас*”, у якасці якога гэтыя напевы існуюць ва ўсведамленні саміх носьбітаў народных песенных традыцый. “Голас” здольны не толькі маркіраваць гукавую прастору каляндарнага свята альбо перыяду, але і вызначаць сваё і чужое культурнае асяроддзе. Дзве гэтыя функцыі, якія З.Мажэйка былі вызначаны як нарматыўна-рэгламентуючая і знакава-апазнавальная [6, с. 44–46], надаюць асобую значнасць каляндарным напевам і вылучаюць іх з іншых песенных практык старажытна-абрадавага пласта.

Праведзеныя ў апошнія дзесяцігоддзі экспедыцыямі Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі (далей – БДАМ) франтальныя палявыя даследаванні амаль паўсюдна на Віцебшчыне і паўночнай Міншчыне, далі магчымасць не толькі ўнесці шэраг карэктываў у музычна-тыпалагічную класіфікацыю валачобных напеваў, але істотна ўдакладніць іх арэальную карціну, спробы адлюстраваць якую ў свой час прадпрымаліся В. Ялатавым [1, с. 47], З.Мажэйка [6, с. 161], аўтарам [3, с. 118].

Такім чынам, для сістэмы паўночнабеларускай рэгіянальнай традыцыі, якая ў найбольшай ступені канцэнтруе розныя праявы валачобнай песеннай традыцыі, характэрны чатыры песенна-меладыйныя тыпы валачобных напеваў.

**Першая група** напеваў – тып I, – што распаўсюджана на большай частцы агульнага арэала валачобных абходаў[2], на беларускім Паазер’і прадстаўлена таксама шырока (карта К6а).

Да тыпу I належаць аднарадковыя напевы з рэфрэнам, якія разам утвараюць музычную страфу. Яны маюць васьміскладовую ў сваёй аснове структуру вершарадка з выраўненым рытмавым малюнкам і цэзурай пасярэдзіне, а таксама сяміскладовую структуру рэфрэна з цэзурай пасля чацвёртага складу (4+4+R4+3):



Колькасць складоў асноўнага вершарадка пры музычным распяванні можа павялічвацца за кошт драблення любой з працягласцей васьміскладовай мадэлі (да 5, 6 радзей 7 складоў у кожным сегменце).

Ладавыя асаблівасці валачобных першага тыпу вызначае тэтрахордавы ў кварце альбо пентахордавы ў квінце комплекс з субквартай (магчыма запоўненай), у аснове якога ляжыць вялікая тэрцыя. Па сваіх мелодыка-інтанацыйных праявах напевы гэтай групы паказваюць дастаткова дыскрэтную карціну. Устойлівай меладыйнай асаблівасцю, характэрнай для большай часткі напеваў тыпу I, з’яўляецца інтанацыйны ход ад першай ступені ўніз на кварту напрыканцы асноўнай часткі вершарадка і пачатак рэфрэна з першай ступені, што разам утварае імператыўны вокліч: I–суб4–I (нот. прыкл.=аудіо 1).

У якасці тыпалагічнай разнавіднасці першай групы – тыпу IA – мы разглядаем напевы, пашыраныя на паўночным захадзе іх агульнага арэала. У мясцовых традыцыях Пастаўскага, паўночнага ўскрайку Мядзельскага і паўднёва-заходняга ўскрайку Глыбоцкага раёнаў (карта К6а) такія напевы могуць з’яўляцца альбо адзіным тыпам валачобных песенных практык, альбо суіснаваць побач з напевамі іншых тыпалагічных груп, у тым ліку з асноўнай версіяй тыпу I (вёскі Кураполле, Волахі Пастаўскага раёна, Брусы Мядзельскага раёна). Тып IA вызначае адметная будова рэфрэна – ён “расцягнуты” за кошт уключэння дадатковага трэцяга сегмента (нот. прыкл.=аудіо 2). Слоўна-паэтычным формулам *Чырвон рожа, сад зялёны вішнёвы* альбо *Вішня ж мая расцвітала зеляна* адпавядае адзінаццаціскладовая з зацягваннем апошняга складу структура вершарадка з цэзурамі пасля 4 і 8 складоў (R4+4+3):



На асобных тэрыторыях напевы першай групы, разам з ўстойлівымі вызначальнымі прыметамі тыпу, могуць быць дадаткова знітаваныя іншымі музычна-стылістычнымі асаблівасцямі і, адпаведна, акрэсліваць ў межах агульнага арэала пэўныя локусы. Пазначаныя такімі асаблівасцямі напевы валачобных характарызуе як адметнасць гукавобразу, так і спецыфіка інтанавання.

У ліку рыс, што вылучаюць напевы мёрска-шаркаўшчынскага локуса – мелодыка-інтанацыйныя і тэмпавыя характырыстыкі (тып I-л1). Ладавая будова гэтых напеваў прадстаўлена тэтрахордам у амбітусе кварты з вялікай тэрцыяй у аснове і запоўненай субквартай. Менавіта ў субквартавай зоне разгортваецца асноўная частка напеву ў большасці такіх ўзораў: імператыўны скачок з субкварты да I ступені спалучаецца з паступовым рухам уніз з II ступені да субкварты. Рэфрэнная частка пачынаецца таксама са скачка, але на сэптыму (радзей сэксту) ўверх, які кампенсуецца паступовым, з паўторам кожнай ступені, рухам уніз да асноўнага тону. Спецыфічнай рысай гэтых валачобных з’яўляецца выкананне ў хуткім тэмпе, што спалучаецца з адсутнасцю цалкам унутрыскладовага драблення (нот. прыкл.=аудіо 3).

Адметнай па лада-інтанацыйных праявах з’яўляецца яшчэ адна лакальная група напеваў тыпу I, якая фіксуецца на поўдні цэнтральнай часткі Паазер’я і якая дае магчымасць зірнуць на інтанацыйную сферу валачобных з іншага ракурсу (тып I-л2). Аналіз мелодыкі гэтых напеваў змушае да іх разгляду ў межах ***веснавога інтанацыйнага комплексу***, а менавіта, як блізкія па інтанацыйных праявах агульна-прымеркаваным да вясны ўзорам лірычнага і балад-

[2] Акрамя Паазер’я напевы гэтай тыпалагічнай групы пашыраны на цэнтральна- і заходнебеларускіх тэрыторыях, у паўночных раёнах Палесся, на левабярэжным Магілёўскім Падняпроўі, заходняй палове Смаленшчыны, часткова на Браншчыне і Чарнігаўшчыне (див. СМЗ, карта К10 – Ред.).

нага зместу[3]. Агульнымі ў абодвух выпадках выступаюць ладавы комплекс, заснаваны на тэтрахордзе ў амбітусе кварты з вялікай тэрцыяй у аснове і субквартай, а таксама, па вызначэнні З. Мажэйка, мелодыка «вярчальнага» характару. Найбольш паказальным мелодыка-інтанацыйным абаротам з'яўляецца ход III–I–суб4–I, які ва ўзорах веснавых можа ляжаць у аснове ўсіх сегментаў музычнай страфы. У валачобных названая меладыйная структура часцей фіксуецца на мяжы асноўнага вершарадка і рэфрэна. «Вярчальны» характар мелодыкі ў асобных выпадках уласцівы асноўнаму вершарадку цалкам (нот. пр.=аудіо 4).

Стылістычнай асаблівасцю, што вылучае валачобныя напевы чашніцка-бешанковіцкага локуса, выступае спецыфічная манера выканання, якая праяўлена на рытма-структурным узроўні – тып I-A3. На тэрыторыі Бешанковіцкага раёна пад час франтальнай экспедыцыі БДАМ (2007 г., кіраўнікі – Т. Бярковіч і В. Прыбылова) намі быў заўважаны шэраг населеных пунктаў, дзе гучанне валачобных напеваў тыпу I пазначана не толькі павольным тэмпам, але і адсутнасцю рытмавай перыядычнасці, што пазбаўляе напеў маршавасці, ўвогуле тыповай для гэтай групы, а ў выпадку спалучэння з "веснавой" інтанацыяй і глісандаваннем, як ва ўзоры з в. Куты, нават надае яму некаторую лірычнасць (нот. пр.=аудіо 5). Адбываецца гэта за кошт ферматы на апошнім складзе асноўнай часткі вершарадка альбо працяглай паўзы перад рэфрэнам. Цікава, што названая традыцыя выканання валачобных песень, як паказалі матэрыялы фанаграмархіва этнамузыкі БДАМ, на чашніцка-бешанковіцкіх тэрыторыях паказвае ўстойлівасць у часе. У прыватнасці, узор, дзе таксама праяўлена названая асаблівасць, быў зафіксаваны на тэрыторыі Бешанковіцкага раёна (в. Стар) каля 40 гадоў таму пад час экспедыцыі Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі (1974 г., кіраўнік – Л. Касцюкавец). Прычым, спявачка спачатку зацягвае перадапошні склад рэфрэна, а прыкладна з другой паловы песеннага ўзору пачынае рабіць доўгі прыпынак пасля асноўнага вершарадка (нот. пр.=аудіо 6).

**Другая група** валачобных абходных віншаванняў – тып II – аб'ядноўвае напевы, у якіх паэтычная страфа таксама складаецца з аднарадковай сэнсавай часткі і рэфрэна. Урачыстая прыўзнятасць гэтых валачобных падкрэслена характэрнымі для многіх узораў воклічамі ў пачатку рэфрэнаў (суб. 4–III; I–IV).

Сэнсавая частка страфы ў напевах прадстаўлена дзесяціскладовікам з цэзурай пасярэдзіне (5+5), з зацяганнем пятага і апошняга складоў пры музычным распяванні: ♪ ♪ ♪ ♪ ♩ ¦ ♪ ♪ ♪ ♪ ♩

Рытмічная будова рэфрэна пазбаўляе напевы тыпу II той перыядычнасці, што ўласціва большасці валачобных першай групы. Рэфрэнная частка ў якасці нарматыўнай мае сяміскладовую структуру з трохскладовым «адсячэннем» (Ф. Калэса). Існуе два варыянты рытмізацыі першай чатырохскладовай групы рэфрэна, адпаведна якім напевы тыпу II геаграфічна выразна разведзены (карта К6б).

На цэнтральных падзвінскіх тэрыторыях – Лепельскі, Ушацкі, поўнач Чашніцкага, заходняя палова Бешанковіцкага, Шумілінскага, Гарадоцкага, усходняя палова Полацкага раёнаў Віцебскай вобласці, часткова Маладзечанскі, Вілейскі, Мядзельскі, Барысаўскі раёны Мінскай вобласці – для першага сегмента рэфрэна характэрна зацягванне другога і трэцяга складоў (тып II-1):




У выніку драблення гэтых складоў могуць таксама ўзнікаць васьмі- альбо дзевяціскладовыя распетыя версіі сяміскладовіка:




На ўсходняй частцы Шумілінскага і Гарадоцкага раёнаў Віцебшчыны, а таксама ў паўднёва-ўсходніх раёнах Пскоўшчыны (Невельскі раён) і паўночна-заходніх ўскраінах Смаленшчыны (Рудненскі раён) першы сегмент рэфрэна арганізаваны як дзве ямбічныя рытмафігуры (тып II-2):




У якасці лада-інтанацыйных асаблівасцей абодвух версій напеваў тыпу II звычайна выступаюць пентахордавы (з захопам сэксты) комплекс у амбітусе квінты (радзей тэтрахордавы ў кварце) з вялікай тэрцыяй у аснове, магчыма з субквартай, субсекундай, і, як тыпова, завяршэнне рэфрэна на II ступені лада (нот. пр.=аудіо 7, 8).

Спецыфічнай рысай **трэццяй групы** валачобных абходна-віншавальных напеваў – тыпу III – выступае кароткая чатырохскладовая ў аснове сэнсавая частка страфы і працяглы сяміскладовы рэфрэн, які нібы "ўкараняецца" ў асноўны вершарадок сваёй двухскладовай групай: 4+(R2+5). Узнікае пэўнае несупадзенне паэтычнай і музычнай формы напеваў тыпу III, бо цэзура ў музычнай форме разбівае ўсю страфу на дзве амаль сіметрычныя (а ў выпадку драблення трэцяй складаноты рэфрэна – цалкам сіметрычныя) групы:




Ладавыя асаблівасці напеваў у роўнай ступені вызначае тэтрахорд у амбітусе кварты (часам пентахорд у амбітусе квінты) з вялікай тэрцыяй у аснове і з запоўненай субквартай. Устойлівай мелодыка-інтанацыйнай характарыстыкай напеваў гэтай групы з'яўляецца сыходны (часта паступовы) рух у рэфрэне ад II ступені лада да субкварты і завяршальны квартавы скачок да асноўнай ступені ў другім сегменце рэфрэна (нот. пр.=аудіо 9).

Арэал напеваў тыпу III на беларускай Поўначы ахоплівае значныя тэрыторыі Полацкага, Глыбоцкага,

[3] Нагадаем, што пэўная колькасць узораў валачобных напеваў таксама фіксуецца з тэкстамі баладнага зместу, і даволі часта існуе, адпаведна каментарыям выканаўцаў, у функцыі паставых песень.

Міёрскага, Браслаўскага, Верхнядзвінскага, Расонскага, а таксама асобныя часткі Докшыцкага і Лепельскага раёнаў Віцебскай вобласці, часткова Маладзечанскі і Лагойскі раёны Мінскай вобласці. Ня менш маштабную тэрыторыю названы арэал акрэслівае таксама ў паўночным накірунку – на Пскоўшчыне, дзе у яго склад трапляюць тэрыторыі Невельскага, Пустошкінскага, Новаржэўскага і часткова Пушкіна-Горскага раёнаў (карта К7а).

Сяміскладовік – тып III-1 – з'яўляецца асноўнай, але не адзінай версіяй рытма-паэтычнай структуры рэфрэна напеваў тыпу III. У асобных узорах заходніх і паўднёвых ускраін арэала пяціскладовы рэфрэн адрозніваецца ад асноўнай версіі адсутнасцю апошняй двухскладовай групы – тып III-2 – і, як след, завяршальнага ўзыходнага скачка на кварту (нот. пр.=аудіо 10):

♪ ♪ ♪ ♪ |R ♪ ♩ ♩ ♪ ♪

На самай поўначы арэала напеваў тыпу III – Пушкіна-Горскі, Новаржэўскі раёны Пскоўскай вобласці – фіксуюцца ўзоры валачобных, якія рытмічным малюнкам рэфрэна больш істотна адмежаваны ад асноўнай версіі тыпу і могуць быць разгледжаны, адпаведна, як яго тыпалагічная разнавіднасць (**тып IIIA**). Мелодыка-інтанацыйны змест такіх напеваў заснаваны на лаканічным квартавым воклічы ў першым сегменце (суб4–I) і паступовым руху ад III да I ступені ў рэфрэне. Сэнсавая частка страфы разам з чатырохскладовым рэфрэнам у напевах Тыпу IIIA утвараюць аднарадковую канструкцыю, якая рытмізавана наступным чынам (нот. пр. 11):

♪ ♪ ♪ ♪ |R ♩ ♪ ♪ ♩

Таксама як тыпалагічную разнавіднасць напеваў трэцяй групы – тып IIIB, – варта разглядаць узоры, зафіксаваныя пераважна на заходняй палове Мёрскага раёна. У сваёй рытма-паэтычнай структуры яны нібыта сумяшчаюць прыкметы розных тыпаў. Сэнсавая частка страфы ў такіх напевах прадстаўлена двойчы паўтораным чатырохскладовікам, што адпавядае рытма-структурным асаблівасцям першага тыпу. Што да рытмічнай і інтанацыйнай структуры рэфрэна, ён аналагічны напевам тыпу III-2 (нот. пр. 12=аудіо 11):

♪ ♪ ♪ ♪ ⁝ ♪ ♪ ♪ ♪ |R ♪ ♩ ♩ ♪ ♪

Амаль усюды, дзе пашыраны напевы тыпу IIIB, яны з'яўляюцца адзіным тыпам валачобных песенных практык. І толькі ў м. Лявонпаль Мёрскага р. зафіксавана існаванне названай тыпалагічнай разнавіднасці побач з асноўнай версіяй напеваў тыпу I, якія выконваюцца на аднолькавы паэтычны тэкст.

Валачобныя абходныя песенныя віншаванні **чацвёртай групы** – тыпу IV – у дачыненні да напеваў тыпу II і тыпу III выступаюць на беларускім Паазер'і яшчэ больш «заходнімі» па пашырэнні.

На шматразовым паўторы «сказавай» ямбічнай рытмафігуры будуецца ў напевах тыпу IV васьміскладовая структура сэнсавай часткі страфы з цэзурай пасярэдзіне і сямі/васьміскладовая структура рэфрэна (4+4+R4+3[4]):



Драбленне другой (часам і чацвёртай) працягласці кожнага з сягментаў асноўнага вершарадка, магчымае пры музычным распяванні у напевах гэтай групы, дае структуру, якая графічна адпавядае рытмаформуле сэнсавай частцы страфы напеваў тыпу II. Аднак прынцыповае адрозненне паміж названымі тыпалагічнымі групамі – ў прыналежнасці іх да розных па прыродзе рытмавых структур – дваічнага і траічнага злічэння і, як вынік, неадпаведнасць рытмаформул па суадносінах у іх моцных і слабых складоў:

♪♪♪♪♩ ⁝ ♪♪♪♪♩ тып II

♪♪♪♪♩ ⁝ ♪♪♪♪♩ тып IV

Ладавы параметр паказвае напевы Тыпу IV пераважна як пентахордавыя ў квінтавым амбітусе, з вялікай тэрцыяй у аснове, магчыма з субквартай. Па інтанацыйных праявах гэтыя напевы ўтвараюць найбольш маналітную групу. Інтанацыйны контур першай часткі напеву ў большасці ўзораў вызначаецца апорай на пэўныя ступені лада, якія прыпадаюць на доўгія працягласці (моцныя склады):

♪♩ ♪♩ ⁝ ♪♩ ♪♩
II V III I

Мелодыка-інтанацыйныя характарыстыкі большасці рэфрэнаў напеваў чацвёртай групы вельмі блізкія да тыпу II. Як устойлівыя інтанацыйныя праявы ў іх фіксуюцца пачатковы ўзыходны скачок ад субкварты да III ступені (часцей) альбо ход ад субкварты на I ступень і потым на III, а таксама завяршэнне на II ступені лада (нот. пр. 13=аудіо 12).

Запісы напеваў тыпу IV былі зроблены на паўночнабеларускіх тэрыторыях у Лагойскім, Пастаўскім, Глыбоцкім, Шаркаўшчынскім, Міёрскім, Верхнядзвінскім і Браслаўскім раёнах. Суцэльны арэал напеваў названай групы уключае, згодна апублікаваным матэрыялам, сумежныя раёны Латгаліі, а таксама вялікі тэрытарыяльны масіў паўднёва-заходніх і цэнтральных пскоўскіх тэрыторый (карта К7б). Адзначым, што па інтанацыйных праявах некаторыя ўзоры пскоўскіх валачобных тыпу IV могуць мець пэўныя адрозненні, такія як адсутнасць названай заканамернасці апорных тонаў у першай частцы напеву. Больш за тое, на дастаткова вялікай тэрыторыі ў паўночна-усходняй частцы арэала валачобных чацвёртай групы напевы вылучаюцца іншым інтанацыйным зместам рэфрэнаў (тып IV-л1). Апошнія, пазбаўленыя «субквартавых воклічаў», маюць завяршэнне на I ступені лада. Такія рэфрэны альбо паўтараюць меладыйны контур асноўнай часткі напеву (нот. пр. 14), альбо разгортваюцца ў межах тэтрахордавага лада-інтанацыйнага комплексу ў амбітусе кварты (нот. пр. 15).

Здзейснены разгляд паказвае, што размежаванне валачобных напеваў на ўзроўні тыпаў адбываецца перш за ўсё па рытмаструктурных характарыстыках. У межах асобных тыпалагічных груп (першай і трэцяй) гэты ж параметр, а менавіта, пэўныя адметнасці ў музычна-рытмавай будове вылучае шэраг напеваў, якія мы разглядаем як тую ці іншую тыпалагічную разнавіднасць. Апошнія заўсёды геаграфічна лакалізаваны; сваім пашырэннем яны вызначаюць кампактныя тэрыторыі ўнутры адпаведных арэалаў.

На ўзроўні лада-інтанацыйных асаблівасцей валачобныя напевы праяўляюць сябе па-рознаму. Такі пара-

метр, як ладавая арганізацыя, аб'ядноўвае музычныя праявы валачобнай песеннай традыцыі. Ён выступае агульным для ўсіх чатырох тыпалагічных груп напеваў і прадстаўлены двума ў роўнай ступені характэрнымі комплексамі: тэтрахордам у амбітусе кварты альбо пентахордам у амбітусе квінты, што маюць вялікую тэрцыю ў аснове, пераважна з субквартай (магчыма запоўненай) альбо субсекундай. Мелодыка-інтанацыйны параметр, хоць і не вызначае ў большасці тыпалагічных груп заканамернасці разгортвання напеву ў цэлым (выключэнне – узоры, прыналежныя чацвёртай групе і пазначаныя заканамернасцю апорных тонаў), але паказвае наяўнасць спецыфічных для кожнага тыпу ўстойлівых інтанацыйных формул у пэўных сегментах напеву, а таксама вылучае розныя ступені ў функцыі завяршальных тонаў. Гэты ж параметр мае непасрэднае дачыненне да ўнутранага структуравання тыпалагічнай групы (тыпы I, III і IV), бо раскрывае наяўнасць ў ёй лакальных разнавіднасцей напеваў.

Высокая ступень дэталізацыі пры тыпалагічным разглядзе валачобных выклікана тым, што, згодна з нашымі назіраннямі, адрозненні на ўроўні тыпалагічных і лакальных разнавіднасцей у напевах, прыналежных адной групе, у большасці ўспрымаюцца носьбітамі народных спеўных традыцый як істотныя, а самі такія напевы, адпаведна, усведамляюцца як іншыя «галасы».

Картаграфаванне тыпаў валачобных абходна-віншавальных напеваў падцвярджае паўсюднасць валачобнай песеннай традыцыі на тэрыторыі паўночнай Беларусі (карта К8а). У гэтым сэнсе валачобніцтва выступае вельмі моцнай апазіцыяй калядаванню, песенныя формы якога ў пэўных частках Падзвіння ўвогуле не фіксуюцца, а на астатніх даволі часта праяўляюць сябе ў абходна-віншавальнай функцыі, як у адной з магчымых.

Напевы першай тыпалагічнай групы на Беларускай Поўначы сустракаюцца не паўсюдна. Выразнай паўночнай мяжой іх пашырэння выступае Заходняя Дзвіна, на правабярэжжы якой напевы тыпу I фіксуюцца спарадычна.

Напевы другой, трэцяй і чацвёртай тапалагічных груп, паводле геаграфічнага размеркавання варта разглядаць як характэрныя з'явы паўночнабеларускай этнапесеннай традыцыі. Іх арэалы, што цягнуцца ад паўночна-заходніх раёнаў Мінскай вобласці і дасягаюць у паўночным накірунку цэнтральна-пскоўскіх тэрыторый, разам утвараюць канфігурацыю, супастаўную з геаграфічнай прасторай крывіцкага этнаарэала ў яго найбольш ранніх (да X стагоддзя) межах.

Асаблівасці пpастоpавага размеркавання тыпалагічных і лакальных разнавіднасцей напеваў, што вылучаны ў межах тыпалагічных груп, заключаюцца не толькі ў кампактнасці іх пашырэння, але і ў аднолькавай геаграфічнай дынаміцы – знаходжанні на ўскраінах адпаведных арэалаў – паўднёва-заходняй і паўночна-ўсходняй частках арэалаў трэцяга і чацвёртага тыпаў, а таксама ў паўночнай частцы арэала першага тыпу. У выніку, узгаданыя тыпалагічныя і лакальныя разнавіднасці канцэнтруюцца ў двух геаграфічных зонах: левабярэжнай частцы Віцебскага Падзвіння (тыпы IA, I-л1, I-л2, I-л3, IIIB) і на цэнтральна-пскоўскіх тэрыторыях на поўнач ад лініі Вялікія Лукі–Апочка (тыпі IIIA і IV-л1).

Такім чынам, правабярэжная частка Віцебскага Падзвіння з выхадам на тэрыторыі Лепельскага раёна і паўднёвыя раёны Пскоўшчыны, ахопленыя пашырэннем асноўных версій напеваў другой, трэцяй і чацвёртай тыпалагічных груп, выступаюць цэнтрам паўночнабеларускіх валачобных традыцый. Адпаведна, перыферыяй арэалаў гэтых традыцый з'яўляюцца левабярэжная частка Віцебскага Падзвіння і цэнтральна-пскоўскія тэрыторыі. У цэнтральных раёнах Пскоўшчыны валачобная песенныя практыкі страчваюць асобныя музычна-стылявыя прыметы тыпавых напеваў і паступова знікаюць, утвараючы зону рассейвання. Зусім іншыя працэсы назіраюцца ў паўднёвых і паўднёва-заходніх раёнах Віцебшчыны, дзе адбываецца перакрыжаванне і налажэнне арэалаў рознанакіраваных у геаграфічным плане валачобных песенных традыцый: тых, што ідуць з поўначы (напевы другога, трэцяга і чацвёртага тыпаў) і тых што працягваюцца з поўдня (напевы першага тыпу). Названыя працэсы могуць быць сведчаннем сутыкнення розных этнакультурных масіваў на левабярэжным Віцебскім Падзвінні, што адбілася на асаблівасцях песеннага ландшафту гэтых тэрыторый.

Атрыманыя вынікі ў чарговы раз сведчаць аб немэтазгоднасці існуючай у этнамузыкалогіі практыцы вывучэння Беларускага Паазер'я, Рускага Паазер'я, Пскоўшчыны як асобных рэгіянальных музычных традыцый. Дарэчы, глыбінная сувязь культуры паўночнабеларускіх, паўднёвапскоўскіх і заходнесмаленскіх тэрыторый раней была раскрыта аўтарам на матэрыяле паўночнабеларускіх калядных напеваў [4], а таксама В. Прыбыловай пры даследаванні масленічных песенна-абрадавых традыцый Верхняга Падняпроўя [9].

## Література


1. Валачобныя песні / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; склад. Г. А. Барташэвіч, Л. М. Салавей ; склад. муз. часткі В. І. Ялатаў ; рэд. тома К. П. Кабашнікаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1980. – 560 с. – (Беларус. нар. творчасць).
2. *Канстанцінава Т. Л.* Аб фактарах цэласнасці музычна-культурнай прасторы крывіцкага этнаарэала (на матэрыяле зімовых і валачобных абходна-абрадавых песенных віншаванняў) : Дыпломная работа. Кафедра беларускай музыкі БДАМ / Кір. Т. С. Якіменка. – Мінск, 1996. – 121 с.
3. *Канстанцінава, Т.* Паўночнабеларускія абходна-песенныя рытуалы як аб'ект этнарэгіянальнага даследавання / Т. Л. Канстанцінава // Вопросы музыкознания и философии музыки : Сб. ст. Вып. 3. / Сост. Т. А. Щербакова. – Минск : Белорусская государственная академия музыки, 2003. – С. 112-118.
4. *Константинова, Т.Л.* Колядные напевы северобелорусской традиции в их ареальных характеристиках: к вопросу географических границ региональной музыкальной системы / Т. Л. Константинова // Северобелорусский сборник : Обряды, песни, наигрыши, плачи, ворожба / Ред.-сост. А. В. Ромодин. – СПб., 2012. – С. 6-16.

5. *Латышева, С. А.* Волочёбные (христославные) песни восточных славян : автореф. дис. ... канд. искусствоведения / С. А. Латышева. – Москва, 2000. – 24 с.
6. *Можейко, З. Я.* Календарно-песенная культура Белоруссии : Опыт системно-типологического исследования / З.Я. Можейко. – Минск: Наука и техника, 1985. – 247 с.
7. *Мухарынская, Л. С.* Беларуская народная музычная творчасць : вучэб. дапам. для муз. ВНУ / Л. С. Мухарынская, Т. С. Якіменка. – Мінск : Вышэйшая школа, 1993. – 342 с.
8. *Мытько, С.* К вопросу изучения белорусского волочебного обряда и волочебных песен / С. Мытько // Белорусский музыкальный фольклор в исследованиях молодых этномузыковедов : сб. ст. / Белорус. гос. консерватория ; сост. Т. С. Якименко. – Минск, 1991. – С. 40–75.
9. *Прыбылова В.* Песенна-абрадавыя традыцыі масленіцы Верхняга Падняпроўя. Аўтарэф. дыс. ... канд. мастацтвазнаўства. Мінск : Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі, 2008. – 20 с.

*Татьяна Константинова (Минск)*

## ВОЛОЧЕБНЫЕ НАПЕВЫ СЕВЕРНОБЕЛОРУССКОЙ ТРАДИЦИИ: АРЕАЛЬНЫЙ АСПЕКТ

В центре внимания статьи – волочёбные напевы белорусского Севера в их типологических и ареальных характеристиках. В результате исследования центром северобелорусских волочёбных традиций определяются правобережные территории Витебского Подвинья и южные районы Псковской области.

*Ключевые слова*: севернобелорусский регион, народнапесенная традиция, музыкально-типологическая классификация, волочебный напев

*Taccyana Kanstancinava (Minsk)*

## VALACHOBNY TUNES OF THE NORTH-BELARUSIAN TRADICION: AREAL ASPECT

The focus of the article – valachobny tunes of the Belarusian North in their typological and areal features. A result of research is that the part of the Vitebsk region on the right bank of the Dvina and southern areas of the Pskov region are the center of the north-Belarusian valachobny traditions.

*Key words*: north-Belarusian region, folk-song tradicion, music-typolodical classification, valachobny tune

### Музичні приклади

Див. також аудіоприклади на DVD_CM4_23_BLR-VLCH-Kanstant

**1.** **в. Крывыя Талачынскага р.**




Зап. Т. Канстанцінава, В. Прыбылова ў 1997 г. ад Конюшка Ганны Маркаўны, 1923 г. н. і гурта жанчын ФЭ БДАМ, №646569

**2.** **в. Волахі Пастаўскага р.**




Зап. экспедыцыя БДАМ пад кіраўніцтвам Т. Бяркович у 2001 г. ад Сабалеўскай Ноны Анатольеўны, 1932 г. н.; ФЭ БДАМ, 1Е27, №13.

**3.** **в. Іст Мёрскага р.**




Зап. экспедыцыя БДАМ пад кіраўніцтвам Т. Бяркович у 2009 г. ад Людскай Зінаіды Фёдараўны, 1927 г. н.; ФЭ БДАМ, 1Е252, №28.

**4.**

**в. Чарнічкі Докшыцкага р.**




Зап. экспедыцыя БДАМ пад кіраўніцтвам Л. Касцюкавец ў 1972 г.; ФЭ БДАМ, 1Е10, №12.

**5.**

**в. Куты Бешанковіцкага р.**




«Валачэбная ўдовам». Зап. экспедыцыя БДАМ пад кіраўніцтвам В. Прыбыловай у 2007 г., ад Брыль Валянціны Мацвееўны, 1931 г. н.; ФЭ БДАМ, 1Е154, №17..

**6.**

**в. Стар Бешанковіцкага р.**




Зап. экспедыцы БДАМ пад кіраўніцтвам Л. Касцюкавец у 1974 г. ад Курмель Аляксандры Рыгораўны; ФЭ БДАМ, 2Е20, №33..

**7.**

**в. Стар Бешанковіцкага р.**




Зап. экспедыцыя БДАМ пад кіраўніцтвам Л. Касцюкавец у 1974 г. ад Казак Фёклы Філіпаўны; ФЭ БДАМ, 2Е20, №32.

**8.**

**в. Дабея Шумілінскага р.**




Зап. экспедыцыя БДАМ пад кіраўніцтвам Т. Якіменка ў 1978 г. ад Варанцовай Еўдакіі Мікітаўны, 1914 г. н.; ФЭ БДАМ, 2Е296, №11.

**9.**

**в. Нямірава Мёрскага р.**




Зап. экспедыцыя БДАМ пад кіраўніцтвам Т. Якіменка ў 1978 г., ад Фурс Ніны Герасімаўны, 1915 г. н., Маняк Еўфрасінні Фёдараўны 1904 г. н., Кабяк Марыі Антонаўны,1907 г.н.; ФЭ БДАМ, 2Е303, №5[1].

[1] Рэальная вышыня асноўнага тону напачатку гэтага ўзору – «cis», паступова яна павышаецца да «d».

**10.** **в. Маргавіца Докшыцкага р.**




Зап. Т. Канстанцінава ў 1996 г. ад Пусташыла Надзеі Паўлаўны, 1910 г. н.; ФЭ БДАМ, 2Е304, №32.

**11.** **[с. Рудняха Новоржевського р-ну]**




Народная традиционная культура Псковской области. Псков, 2002. Т.1. С. 444, №8.

**12.** **в. Мілейкі Мёрскага р.**




Зап. экспедыцыя БДАМ пад кіраўніцтвам Т. Канстанцінавай ў 2009 г. у в. р. ад Лакотка Зінаіды Фёдараўны, 1929 г. н.; ФЭ БДАМ, 1Е257, №14

**13.** **в. Волахі Пастаўскага р.**




Зап. экспедыцыя БДАМ пад кіраўніцтвам Т. Бярковіч у 2001 г., ад СабалеўскайНоны Анатольеўны, 1932 г. н.; ФЭ БДАМ, 1Е27, №11.

**14.** **[с. Черепяги Локнянського р-ну]**




Народная традиционная культура Псковской области. Псков, 2002. Т.2. С .52, №3[2]..

**15.** **[с. Самолуково Локнянського р-ну]**




Народная традиционная культура Псковской области. Псков, 2002. Т.2. С. 52, №5

---

[2] З мэтай захавання адзіных прынцыпаў нотнага адлюстравання напеваў гэты і наступны ўзоры пададзены не ў арыгінальнай натацыі.